Цифровые технологии, в особенности социальные сети, значительно облегчают распространение дезинформации, создавая серьезную угрозу для демократических процессов и общественного доверия. Быстрота распространения информации в онлайн-среде, а также отсутствие строгой модерации на многих платформах, создают фейковые новости и делают пропагандистские материалы чрезвычайно эффективными инструментами манипуляции общественным мнением.

2. Защита персональных данных.

Сбор и использование персональных данных представляют собой серьезную угрозу приватности граждан и могут иметь далеко идущие негативные последствия. Важно повышать гражданскую осведомленность в области защиты персональных данных и обучать людей осторожно и ответственно подходить к предоставлению своей информации в онлайн-среде.

Одна из наиболее тревожных угроз, которую несут современные цифровые технологии, заключается в их потенциале провоцировать информационные войны. Информационная война – это сложный и многогранный конфликт, в котором применяются нетрадиционные методы, такие как целенаправленное распространение дезинформации (фейковых новостей, пропаганды, манипулирующих нарративах), кибератаки на критическую инфраструктуру и государственные системы, психологические операции, направленные на подрыв морального духа населения и манипулирование общественным мнением, а также компрометация репутации и дискредитация противоборствующих сторон.

Общество должно стремиться к созданию безопасной и этичной цифровой среды, которая будет способствовать демократии и уважению прав человека. Необходимо учитывать как преимущества, так и риски цифровых технологий, чтобы использовать их возможности для улучшения политических процессов, защищая при этом демократические ценности и гражданские свободы.

***А.В. Гаўрыкаў****, настаўнік*
*СШ № 1 (Копішча)*

## ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ: КРОК НАПЕРАД І ДВА НАЗАД (ІНСТЫТУЦЫЯНАЛЬНЫ І СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД)

На фоне змянення ўнутранага і знешнепалітычнага вектара развіця нашай краіны для Рэспублікі Беларусь застаецца ў прыярытэце фарміраванне грамадзянскай супольнасці і дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы (адна з галоўных задач Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 г. [6]). Усе дзейныя

ў краіне палітычныя партыі, якія зарэгістраваны ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь, прайшлі перарэгістрацыю ў адпаведнасці з патрабаваннямі змяненняў і дапаўненняў у Закон аб палітычных партыях. З 15 зарэгістраваных на той момант партый перарэгістрацыю прайшлі тры [8], гэта азначае прызнанне дзяржавай правасуб’ектнасці партый, адпаведнасці іх арганізацыйных прынцыпаў, праграмных установак і шляхоў рэалізацыі палажэнням Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь.

Нягледзячы на тое, што адным з галоўных кампанентаў палітычнай сістэмы практычна ўсіх развітых дзяржаў з’яўляюцца палітычныя партыі як важныя і неабходныя канструкты сучаснага грамадства, ў нашай краіне палітычныя партыі пасля шэрагу інстытуцыйных рэформаў і трансфармацыі партыйнай сістэмы не ў поўнай меры выкарыстоўвалі прадстаўленыя ім палітычныя магчымасці. Аб гэтым сведчаць вынікі сацыялагічных даследаванняў. Інстытуцыйна прадстаўніцтва партый у Палаце прадстаўнікоў і Савеце рэспублікі вырасла: вынікі выбараў 2024 г. паказалі, што ў новым складзе парламента 70 дэпутатаў з’яўляюцца членамі палітычных партый. У ніжняй палаце прадстаўлены партыя «Белая Русь» (51 чалавек, або 46,4 %), Камуністычная партыя Беларусі (7 чалавек, або 6,4 %), Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі (4 чалавекі, або 3,6 %), Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (8 чалавек, або 7,3 %) [7]. Павелічэнне партыйных дэпутатаў адбылося ў выніку інстытуцыялізацыі партыі «Белая Русь». Астатнія партыі істотна не павялічылі сваю прысутнасць у Палаце прадстаўнікоў.

Да перарэгістрацыі 2023 г. апошні рэйтынг падтрымкі палітычных партый быў складзены ў 2019 г., калі ім давярала толькі 2,6 % рэспандэнтаў, а 50,6 % не давяралі або хутчэй не давяралі. Пры гэтым аб гатоўнасці ўдзельнічаць у дзейнасці палітычных партый заявілі толькі 0,4 % апытаных грамадзян [4, с. 163].

У 2023 г. Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў адзначае невысокі (каля 30 % апытаных) узровень даверу палітычным партыям з боку насельніцтва. Гэта на 14 % больш, чым у годзе папярэднім [1]. Слабым звяном у дзейнасці сучасных беларускіх палітычных партый застаецца асвятленне іх працы ў сродках масавай інфармацыі, што ўплывае на пазнаванне партыі і яе кандыдатаў, дэманструе яе актыўнасць, прыцягвае тую частку электарату, якая яшчэ не вызначылася, робіць акцэнт на базавых ідэях і праграмных палажэннях.

Аналіз асацыятыўнага шэрагу («воблака тэгаў») сведчыць аб фокусе ўвагі і на кіраўніках палітычных партый. Так, за час маніторынгу лідар Беларускай партыі «Белая Русь» А. Раманаў згадваўся 1565 разоў, лідар ЛДПБ А. Гайдукевіч – 1045, першы сакратар ЦК КПБ А. Сокал – 110, лідар РППС А. Хіжняк – 32 [1]. Лідары амаль усіх партыяў бяруць удзел у выбарчай кампаніі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, чым гіпатэтычна павінны павялічыць сваю ролю ў палітычным жыцці краіны.

Важнай з’яўляецца пазіцыя, выказаная дзеючым Прэзідэнтам: выступаючы са штогадовым пасланнем беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь 31 сакавіка 2023 г., Прэзідэнт А.Р. Лукашэнка адзначыў: «Мы никогда не препятствовали и не будем препятствовать партийному строительству. Особенно если инициатива идет от людей, искренне любящих свою страну, свой дом, свою семью, настроенных на мирное будущее своих детей. … И депутаты, какую бы партию или общественное движение они ни представляли, прежде всего должны служить людям, а не интересам отдельных олигархов и политиков, тем более зарубежных» [2].

Максімальна крызіс шматпартыйнай сістэмы выявіўся ў 2020 г. У самы цяжкі момант для дзяржавы ніводная палітычная партыя, ніводнае грамадскае аб’яднанне не стала актыўным удзельнікам палітычных працэсаў. Стала зразумела, што ментальна тыя палітычныя партыі і грамадскія структуры, якія былі ў 2020 г., і іх кіраўнікі не здолеюць перамагчы ў палітычнай барацьбе за традыцыйныя каштоўнасці, ідэі і сапраўдныя сэнсы беларускага грамадства.

Улічваючы вышэйпададзенае, варта адзначыць наступныя фактары, якія аказалі ўплыў на палітычныя партыі, якія дзейнічалі у 2020–2023 г.:

– з'яўленне новых палітычных гульцоў і ўскладненне ўнутрыпартыйнай структуры на фоне змены грамадска-палітычнай сітуацыі;

– большасць публічных запытаў была агучана не палітычнымі партыямі, а грамадскімі аб’яднаннямі, групамі інтарэсаў і групамі ціску, блогерамі, лідэрамі грамадскай думкі;

– усе часцей палітыку праводзяць новыя палітычныя актары (эколагі / зяленыя, феміністкі, лібертарыянцы і г.д.), якія выкарыстоўваюць эфект навізны і прыцягваюць масавы электарат за кошт адыходу ад традыцыйных мадэляў і фарматаў узаемадзеяння, а таксама задавальняюць бягучы попыт сярод моладзі на абнаўленне;

– абвастрэнне супрацьстаяння калектыўнага Захаду і ЗША, з аднаго боку, і Расіі і КНР, з другога;

– рознае ўспрыманне насельніцтвам краіны пачатку СВА;

– змены і дапаўненні ў Канстытуцыю, прынятыя па выніках рэспубліканскага рэферэндума 27 лютага 2022 г.

У выніку краіне спатрэбілася структураванне партыйнага поля і ўпарадкаванне дзейнасці палітычных партый як інстытута, які мог бы ў поўнай меры прадстаўляць інтарэсы насельніцтва пад час выбараў у прадстаўнічы і заканадаўчы орган ўлады 25 лютага 2024 г. і прэзідэнцкай кампаніі 2025 г.

Перад беларускай дзяржавай стаіць вельмі няпростая задача (на наш погляд, менавіта зверху зыходзіць ініцыятывы трансфармацыі партыйнай сістэмы нашай краіны) – стварыць прынцыпова новую партыйную сістэму, якая будзе адпавядаць часу, менталітэту народа і задачам, якія стаяць перад краінай, быць актыўным палітычным інстытутам.

Інстытуцыйныя рэформы Закона аб палітычных партыях 2023 г. і перарэгістрацыя палітычных партый у нашай краіне прывялі да таго, што сення актыўныя чатыры палітычныя партыі. Як вынік, пасля ўсіх арганізацыйных зменаў на палітычным полі Беларусі засталіся толькі тыя палітычныя партыі, якія альбо падтрымліваюць дзяржаўны курс (КПБ, РППС, партыя «Белая Русь»), альбо знаходзяцца ў намінальнай канструктыўнай апазіцыі (ЛДПБ), і адпавядаюць асноўным напрамкам унутранай і знешняй палітыкі беларускай дзяржавы, канцэпцыі яго нацыянальнай бяспекі і ваеннай дактрыне [2]. Мінулы год стаў часам, калі рэальнасць, якая хаатычна мяняецца, стала набываць пэўныя палітычныя контуры, калі стала фарміравацца новая палітычная свядомасць беларускага грамадства і назiралася змяненне дзяржаўнай унутранай і знешняй палітыкі.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка на прыеме наконт Старога Новага года адзначыў, что «наша задача одна – мир и покой в нашем государстве. Всех нас объединяют преданность Родине и ответственность за ее судьбу. Прошлый год мы шли к миру через созидание, укрепляли единство, государственные ценности – естественные основы будущего нашего государства. Мы уже с вами живем Годом качества. Но я хочу, чтобы вы понимали: качество – это не только про экономику и производство. Но это, прежде всего, про человека» [3].

Тым часам на палітычную арэну выходзяць новыя пакаленні, якія жадаюць аб сабе заявіць. Але гэтыя пакаленні ў вельмі малой ступені выкарыстоўваюць для самарэалізацыі партыйна-палітычную сістэму: партыі ўспрымаюцца імі як структуры неактыўныя, актуальныя палітычныя праблемы маладыя людзі жадаюць абмяркоўваць не на партыйных сходах, а ў сацыяльных сетках.

У сучасных умовах палітычны дыскурс актыўна пераходзіць у інтэрнэт-прастору. Палітычныя партыі і іх кіраўнікі маюць магчымасць выкарыстоўваць вэб-рэсурсы для дэманстрацыі пазіцыі па найбольш важных сацыяльна-палітычных пытаннях. Сацыяльныя сеткі праз свае асаблівасці (даступнасць, мультымедыйнасць, хуткасць распаўсюджвання інфармацыі, сеткавую структуру, інтэрактыўнасць) валодаюць значна большым патэнцыялам для ўплыву на выбаршчыкаў, чым тэлебачанне, радые і газеты. Інтэрнэт у сферы выбарчых тэхналогій з'яўляецца сення найважнейшым механізмам перадачы інфармацыі, эфектыўным сродкам палітычнага ўплыву і заваявання даверу шырокіх народных мас. Медыятэхналогіі ствараюць для партый унікальную магчымасць прыцягваць выбаршчыкаў праз пасты, фота і відэа, прапаноўваць разнастайныя, эфектыўныя, насычаныя навіны [5, с. 65].

Усе палітычныя партыі Беларусі цяпер перажываюць палітычны рэнесанс, аднак пакуль на практыцы не прапануюць у сваіх ідэалагічных дактрынах практычнага вырашэння новых эканамічных, палітычных, сацыяльных і сацыякультурных пытанняў. Сучасныя партыі, ствараючы новыя

і ўдасканальваючы існуючыя механізмы дзейнасці, павінны вывучаць інтарэсы і спадзяванні народа, ісці ім насустрач, забяспечваць рэалізацыю іх пажаданняў.


**Крыніцы**

1. В БИСИ рассказали, чего белорусы ждут от политических партий // БелТА. – URL: https://www.belta.by/society/view/v-bisi-rasskazali-chego-belorusy-zhdut-ot politicheskih-partij-598749-2023 (дата обращения: 02.04.2024).
2. Встреча с руководителями политических партий. 10 ноября 2023 г. // Президент Республики Беларусь. Официальный портал. – URL: https://president.gov.by/ru/events/vstrecha-s-rukovoditelyami-politicheskih-partiy (дата обращения: 05.02.2024).
3. Выступление Александра Лукашенко на приеме от имени Президента Беларуси на старый Новый год // СБ – Беларусь сегодня. – 2024. – 13 января. – С. 2.
4. Гавриков, А. В. Политические партии «в поисках смысла», или почему в Беларуси нет успешных партий? / А. В. Гавриков // Иппокрена. –2021. – №1–2. – С. 159–172.
5. Гаўрыкаў, А. В. Палітычныя партыі ў беларускай медыя- і інтэрнэт-прасторы (палітыка-сацыялагічны аспект) / А. В. Гаўрыкаў // Беларуская думка. – 2024. – № 10. – С. 62–66.
6. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2030 г. // ЭТАЛОН : информ.-поиск. система (дата обращения: 11.11.2024).
7. Осипов, М. Карпенко – о том, какие партии Беларуси стали парламентскими / М. Осипов // СБ – Беларусь сегодня. – 2024. – 26 февраля. – С. 3.
8. Политические партии // Президент Республики Беларусь. Официальный портал. – URL: https://president.gov.by/ru/belarus/society/politicheskie-partii (дата обращения: 18.11.2024).



***Н.И. Голубецкая**, доктор исторических наук, профессор*
***Т.М. Чиркова**, кандидат экономических наук, доцент*
*СПбУТУиЭ (Санкт-Петербург)*


## ПРОБЛЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ ИНСТИТУЦИОНАЛЬНЫХ ИНСТРУМЕНТОВ В УСЛОВИЯХ ГЕОПОЛИТИЧЕСКОЙ ТРАНСФОРМАЦИИ

Исследование роли институциональных инструментов регулирования в повышении эффективности взаимодействия государства и общества в цифровом пространстве позволяет определить сценарии трансформации